3. Берберова, Н.Н. Люди и ложи. Русские масоны XX столетия / Н.Н. Берберова. – Харьков: Калейдоскоп; М.: Прогресс-Традиция,1997. – 400 с.
4. Всеподданнейший отчет Виленского, Гродненского и Ковенского генерал-губернатора П.Д. Святополк-Мирского Николаю II / падрыхт. да друку М. Біч, В. Пінчукоў // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 2. – С. 94 – 117.
5. Друцкой-Соколинский, В.А. На службе отечеству. Записки русского губернатора (1914 – 1918 гг.) / В.А. Друцкой-Соколинский. – Орел: РКФ «3 июля»; РИГ «Невероятный мир», 1994. – 405 с.
6. Дубнов, С.М. Книга жизни: Воспоминания и размышления: Материалы для истории моего времени / С.М. Дубнов. – СПб.: «Петербургское востоковедение», 1998. – 672 с.
7. Из следственных дел Н.В. Некрасова 1921, 1931 и 1939 годов / Вступ. ст. В.В. Поликарпова // Вопросы истории. – 1998. – № 11-12. – С.10 – 48.
8. Николаевский, Б.И. Русские масоны и революция / Б.И. Николаевский; ред.-сост. Ю. Фельштинский. – М.: ТЕРРА, 1990. – 200 с.
9. Никонович, Ф.И. Из дневника члена Государственной Думы от Витебской губернии протоирея о. Федора Никоновича / Ф.И. Никонович. – Витебск, 1912. – 272 с.
10. Русское политическое масонство. 1906 – 1918 гг. (Документы из архива Гуверовского института войны, революции и мира) / вступ. ст. и коммент. В.И. Старцева // История СССР. – 1989. – № 6. – С.119 – 134; 1990. – № 1. – С.139 – 156.
11. Серков, А.И. Русское масонство, 1731 – 2000. Энциклопедический словарь / А.И. Серков. – М.: РОССПЭН, 2001. – 1222 с.
12. Фрагмэнты Дзеньніку М. Ромэра / пер. А. Смалянчука // Спадчына. – 1998. – № 5. – С.59 – 67.

**Хаданёнак В.М.**

## КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў ФОНДАХ ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ І ЗАНАЛЬНАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА Ў ГОРАДЗЕ ПОЛАЦКУ

Пераважная большасць дакументаў, якія тычацца Першай сусветнай вайны на беларускіх землях, захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску. Але ж даволі шырокі пласт дакументаў па дадзенай праблематыцы ёсць у сховішчах Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і Занальнага дзяржаўнага архіва ў горадзе Полацку.

У Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці можна знайсці шмат матэрыялаў па становішчу членаў прафсаюзаў у гады Першай сусветнай вайны. Гэтай тэматыцы адпавядаюць фонды 52 (Віцебскае губернскае аддзяленне Усерасійскага прафесійнага саюза рабочых металістаў) і 39 (Віцебскае губернскае аддзяленне Усерасійскага прафесійнага саюза рабочых і служачых гарбарнай вытворчасці). У дадзеных фондах можна знайсці пратаколы паседжанняў праўлення Віцебскага губернскага аддзялення УСРМ; пратаколы паседжанняў агульных сходаў служачых Віцебскага гарадскога вадаправода; праграму VII з’езда Усерасійскага саюза рабочых гарадоў; спісы рабочых і служачых Віцебскага вадаправода; заявы аб прыняцці ў члены прафсаюза металістаў; рознага кшталту анкетныя лісты; пратакол паседжанняў Паўночнай абласной нарады прафесійных саюзаў рабочых гарбарнай вытворчасці і матэрыялы да яго; заявы членаў прафсаюза аб паляпшэнні ўмоваў працы; пратаколы паседжанняў канфліктнай камісіі прафсаюза рабочых металістаў; пасведчанні членаў саюза металістаў; пратаколы сходаў рабочых ігольнай фабрыкі Левінсона і г.д.

Фінансавае становішча рабочых, якое і так было дужа складаным, надзвычай пагоршыла Першая сусветная вайна. Шмат прызыўнікоў, якія былі адзінымі кармільцамі ў сям’і, прасілі ў прафесійных саюзаў, каб тыя паклапаціліся пра іх старых бацькоў і малых дзяцей, якія былі пакінуты без сродкаў на існаванне. Нярэдкімі былі заявы ў праўленні прафесійных саюзаў наступнага зместу: “Аддаў на навучанне слесару механічнай працы свайго сына. Але з-за абвастрыўшайся дарагавізны не маю магчымасці яго ўтрымліваць за такую мізэрную плату. А таму прашу ўстанавіць для майго сына адпаведны заробак. Бо працу мой сын выконвае ўсялякую ад 8-мі гадзінаў раніцы да 8-мі гадзін вечара” [1, л.3].

Асаблівую цікавасць для вывучэння стану сельскай гаспадаркі на неакупаванай тэрыторыі ўяўляюць сабой наступныя фонды ДАВВ: 5 (Віцебскі губернскі харчовы камітэт), 954 (Віцебскі павятовы харчовы камітэт) 14 (Зямельнае Упраўленне

Репозиторий ВГУ

выканаўчага камітэта Віцебскага губернскага савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў). Яны змяшчаюць у сабе цэлы шэраг каштоўных дакументаў, а менавіта: журналы нарад і цыркуляры міністэрства харчавання па пытаннях харчу; пастановы з'ездаў прадстаўнікоў губернскіх харчовых камітэтаў; загады міністра харчавання; журналы нарад загадчыкаў нарыхтоўкай сена ў паветах Віцебскай губерніі; справы аб прыёме і здачы сена ў Віцебскім павеце; маршруты рэквізіцый буйной рагатай жывёлы па Віцебскаму павету для патрэбаў арміі; пастановы камітэта аб правядзенні закона аб хлебнай манаполіі, аб устанаўленні цвёрдых коштаў на муку; справы аб наяўнасці сельскагаспадарчых прыладаў працы і машынаў на складах Віцебскага павятовага земства і г. д.

Нягледзячы на тое, што ад эфектыўнай працы сялян залежала забеспячэнне арміі харчам і фуражам, грошы на сельскую гаспадарку амаль не выдаткоўваліся. Не хапала фінансаў нават на выплату заробкаў для канцылярскіх служачых харчовых упраў: "…служачыя Суражскай харчовай управы трэці месяц не атрымоўваюць ніякай аплаты" [2, л.1]. Са Старасельскай валасной харчовай управы пісалі ў Віцебск: "вам не адаслалі спісы тых, хто валодае скацінай з-за таго, што ў нас ніхто не жадае працаваць бясплатна. Справаводца А. Жыро прапрацавала 2 месяцы і атрымала 100 рублёў, больш працаваць не стала. Затым іншага нанялі Я. Сініцына, і ён папрацаваў штосьці каля 3-ох тыдняў, і бачучы, што ніхто амаль нічога не атрымлівае - адмовіўся. А таксама члены ўправы не жадаюць выконваць свае службовыя абавязкі з-за неатрымання аклада. А таму просім Віцебскую павятовую харчовую ўправу паклапаціцца зараз жа даслаць Старасельскай харчовай управе грошаў для ўплаты жалавання служачым, і для найма справаводцы [3, л.21-21 аб.].

Дакументы, звязаныя з дзейнасцю работнікаў органаў аховы правапарадку, а таксама разгляд крымінальных і адміністрацыйных злачынстваў можна знайсці ў фондзе 234 (Народны суд Полацкага павета 2-га ўчастка) ЗДАгП і шматлікіх фондах ДАВВ: 1178 (народны суд Віцебскага павета 2-га ўчастка), 75 (народны суд Віцебскага павета 4-га ўчастка), 994 (Упраўленне Віцебскай гарадской рабоча-сялянскай міліцыі), 1640 (начальнікі раёнаў Віцебскай павятовай міліцыі), 520 (народны суд Віцебска 1-га ўчастка) і г. д. У дадзеных фондах ёсць спісы служачых міліцыі; дэкрэты Віцебскага губернскага савета сялянскіх, рабочых, салдацкіх і батрацкіх дэпутатаў аб хабарніцтве і судах; каштарыс выдаткаў на ўтрыманнне Віцебскай гарадской савецкай міліцыі ў 1917 г.; мноства дакументаў, якія тычацца разгляду крымінальных справаў. На падставе дакументаў з 994 фонда добра бачна, як пасля ўвядзення "сухога закона", надзвычай абвастрылася пытанне па барацьбе з самагонаварэннем. Адпаведна ўзраслі і патрабаванні да супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Цяпер ад іх патрабаваліся не толькі адмысловыя веды ў дадзенай галіне. Яны павінны былі ўмець : устанавіць прыроду і ўласцівасці затрымліваемых вадкасцяў, вымяраць колькасць і моцнасць напояў, даваць заключэнне аб прыдатнасці да патаемнага вінакурэння затрымліваемых прыстасаванняў і матэрыялаў, весці перагонку знойдзеных вадкасцяў, вызначаць від і гатунак тытунёвых вырабаў, каб устанавіць памер адказнасці [4, л.87].

Чыгунка ў гады Першай сусветнай вайны не проста мела выключнае значэнне, але і была "галоўным нервам, галоўнай сувяззю дзяржавы" [4, л.75]. Шмат матэрыялаў па яе функцыянаванні ў ваенны час знаходзіцца ў фондах 106 (станцыя "Віцебск" Арлоўска-Віцебскай чыгункі) і 573 (Віцебскае транспартнае спажывецкае таварыства) ДАВВ. У прыватнасці яны змяшчаюць пратаколы камісіі па раскватараванні чыгуначнікаў, якія пражывалі ў вагонах; прашэнні на імя начальніка станцыі "Віцебск" ад эвакуяваных з Рыгі; тэлеграфныя ліставанні з Упраўленнем дарогі аб хуткіх, пасажырскіх і змешаных цягніках і аб перавозцы пасажыраў; палажэнне начальніка дарогі аб тэхнічна-гаспадарчых камітэтах па Рыга-Арлоўскай чыгунцы; ліставанне з цэнтральным харчовым камітэтам Рыга-Арлоўскай чыгункі аб забеспячэнні супрацоўнікаў; загады начальніка ваенных зносінаў Заходняга фронта за 1917 г. па Рыга-Арлоўскай чыгунцы і г. д. Сапраўдным бічом для

Рэпазіторый ВДУ

работнікаў чыгункі быў пастаянны недахоп прадуктаў харчавання. Часам здаралася так, што з-за поўнай адсутнасці прадуктаў на бліжэйшых кірмашах прыходзілася іх прывозіць "…з такіх аддаленых мясцовасцяў, як Самарская, Тамбоўская і Палтаўская губерні і Данская вобласць, з-за чаго азначаныя прадукты знаходзіліся доўгі час у дарозе" [5, л. 29 аб.]. Калі ж прадукты ўсё ж прыходзілі на вузлавыя станцыі, то ўзнікалі значныя праблемы па іх размеркаванні. Асабліва цярпелі пры гэтым падзённыя рабочыя. Ім належала атрымоўваць прадукты толькі на саміх сябе, а на жонак і дзяцей такія не выдаваліся: "Усім падзённым рабочым, хаця бы і сямейным, варта выдаваць прадукты як адзінокім" [6, л. 83]. Такая жорсткая мера была ўведзена ў сувязі з тым, што лічылася, быццам бы падзённыя рабочыя ў абсалютнай сваёй большасці пражывалі ў вёсках. А там яны мелі свой сялянскі надзел і апроч таго карысталіся правам атрымоўваць прадукты ад гарадскіх, сельскіх, альбо земскіх арганізацый. Зразумела, што гэта было не заўжды так. Толькі 1 траўня 1917 г. выйшла пастанова, згодна з якой "падзённы рабочы, які лічыў сябе на асобым становішчы, мог падаць хадайніцтва ў Камітэт з указаннем месца жыхарства сям'і і абавязкам прадаставіць пасведчанні аб неатрыманні прадуктаў у грамадскіх арганізацыях" [6, л. 59-59 аб.]. Вядома ж , што далёка не ўсе такія хадайніцтвы задавальняліся.

Для вывучэння пошты і тэлеграфа ў гады вайны даследчыку варта скарыстацца 263 (Полацкая паштова-тэлеграфная кантора) фондам ЗДАгП. Ён змяшчае ліставанне са Смаленскім паштова-тэлерафным упраўленнем; ведамасці са справаздачамі аб прыбытках паштовых аддзяленняў за лістапад-снежань 1917 г.; ліставанне з паштовымі аддзяленнямі аб руху карэспандэнцыі; цыркуляры Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі Галоўнага ўпраўлення пошты і тэлеграфаў; тэлеграфы і распараджэнні начальніка Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі; цыркуляры Смаленскай паштова-тэлеграфнай акругі па фінансавых пытаннях і ведамасці на выдачу заробкаў служачым канторы і г. д. Нягледзячы на проста самаахвярную працу часткі паштова-тэлеграфных служачых, работа шэрагу паштовых аддзяленняў выклікала справядлівыя нараканні з боку насельніцтва. З розных гарадоў і вёсак, а таксама і розных часцей фронта паступалі скаргі на недастаткова ўважлівыя адносіны з боку паштова-тэлеграфных служачых да патрэбаў людзей, і ў прыватнасці на зусім не дапушчальную з'яву: знікненне газетаў, лістоў, тэлеграм і пасылак [8, арк. 280]. Само ж кіраўніцтва поштай лічыла, што "…дрэнны стан паштова-тэлеграфнай справы залежыць ад тэхнічнай адсталасці, атрыманай урадам рэвалюцыйнай Расіі ў спадчыну ад старой улады, ад недахопу штатаў, недахопу паштовых вагонаў, тэлеграфных апаратаў, паштова-тэлеграфных кантораў " [8, арк. 262].

Шмат карыснай інфармацыі з розных сфераў жыцця ў гады Першай сусветнай вайны можна знайсці ў 51 (Выканаўчы камітэт Полацкага павятовага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў) фондзе ЗДАгП. У прыватнасці там змяшчаюцца справы аб асігнаванні сродкаў на ўтрыманне настаўнікаў земскіх вучэльняў Полацкага павета; ведамасці на выдачу заработнай платы работнікам аддзелаў павятовага выканкама з 15 жніўня па 15 снежня 1918 г.; анкетныя лісты і рэгістрацыі замежных грамадзянаў і г.д.

Надзвычай інфарматыўным для вывучэння становішча на франтах у гады вайны з'яўляецца фонд 2289 (калекцыя перыядычнага друку, тэматычных падборак перыядычнага друку і неперыядычных выданняў за 1886 – 1991 гг.) ДАВВ. Ён змяшчае загады па Дзвінскай ваеннай акрузе на тэатры ваенных дзеянняў; загады галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронту за верасень – снежань 1917 г.; абвесткі па Дзвінскай ваеннай акрузе за 1916 г.; абавязковыя пастановы Галоўнакамандуючых Паўночнага і Заходняга франтоў; загады арміям Паўночнага фронту за 1917 г.; загады Галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронту за 1917 г. і г. д.

Так з загада Галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронту ад 8-га верасня 1917 г. за № 911 можна даведацца, што "… увесь час не спыняюцца гвалтоўныя дзеянні



Рэпазіторый ВДУ

і самаўпраўства, скіраваныя да вырашэння самаўладным шляхам розных сельскагаспадарчых пытанняў. Дзеянні такога кшталту ў корані нішчаць сельскую гаспадарку краіны, пазбаўляюць насельніцтва Расійскай рэспублікі і нашу армію неабходных прадуктаў сельскай гаспадаркі і пагражаюць голадам" [7, арк. 43]. Але ж, нягледзячы на ўсведамленне ўсіх цяжкасцяў, якія зазнала на сабе мясцовае насельніцтва, у той жа самы дзень (8 верасня 1917 г.) выдаецца загад эксплуатацыйным камісіям. Згодна з ім, эксплуатацыйныя камісіі неадкладна павінны пачаць рэквізіцыі жывёлы ў вясковага насельніцтва ў 30-ці вярстовай прыфрантавой зоне. Па заканчэнні рэквізіцыі жывёлы ў той жа прыфрантавой паласе правесці рэквізіцыю бульбы і гародніны, а затым хлеба і фуража" [7, арк. 20 – 20 аб.].

Такім чынам, без дэталёвага выкарыстання асобных фондаў ДАВВ і ЗДАгП, усялякае вывучэнне Першай сусветнай вайны на беларускіх землях будзе не поўным.


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей ДАВВ). Фонд 52. Воп. 1. Спр.1.
2. ДАВВ. Ф. 954. Воп. 6. Спр. 3.
3. ДАВВ. Ф. 954. Воп. 6. Спр. 4.
4. ДАВВ. Ф. 994. Воп. 1. Спр. 1.
5. ДАВВ. Ф. 573. Воп. 3. Спр. 1.
6. ДАВВ. Ф.106. Воп. 1. Спр. 4. Т. 1.
7. ДАВВ. Ф. 2289. Воп. 1. Спр. 22.
8. Занальны дзяржаўны архіў у горадзе Полацку. Ф. 263. В. 1. Спр. 1.



**Рындин С.Н.**


## ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ТРУДА ИНОСТРАННЫХ ВОЕННОПЛЕННЫХ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1914–1917 гг. ПО МАТЕРИАЛАМ НАЦИОНАЛЬНОГО ИСТОРИЧЕСКОГО АРХИВА БЕЛАРУСИ

Пребывание иностранных военнопленных на белорусской земле и использование их труда в годы Первой мировой войны – один из недостаточно изученных аспектов отечественной истории. В 1914 г. российские военные власти исключали возможность постоянного содержания военнопленных на территории западных губерний в виду их прифронтового положения. В Беларуси создавались пересыльные пункты, куда направляли пленных солдат и офицеров для отправки вглубь России. Но в дальнейшем, в условиях дефицита на местном рынке рабочей силы сотни военнопленных стали работать в промышленности и сельском хозяйстве Беларуси. Их значение для белорусской экономики в период Первой мировой войны ещё не становилось предметом тщательного научного исследования.

В фондах Национального исторического архива Беларуси (НИАБ) хранятся документы, содержащие наиболее полные сведения об иностранных военнопленных на территории трёх белорусских губерний: Минской, Витебской и Могилёвской. Они подразделяются на законодательные и делопроизводственные документы.

Основным нормативным актом являлось Положение о военнопленных, обнародованное в «Собрании узаконений и распоряжений правительства» 16 октября 1914 г. Положение предусматривало привлечение военнопленных, за исключением офицеров, к казенным и общественным работам. Но при этом указывалось, что труд пленных не должен иметь отношения к войне и быть изнурительным. Какое-либо вознаграждение за этот труд не полагалось [4, с. 3813]. В следующем году в России началось широкое использование военнопленных как рабочей силы, для чего была подготовлена специальная нормативно-правовая база. 16 сентября 1914 г. Совет Министров утвердил «Правила о порядке предоставления военнопленных для исполнения казенных и общественных работ в распоряжение заинтересованных в том ведомств». Это был первый документ, подробно освещавший условия содержания, приёма и сдачи военнопленных работников [2, л. 4 – 4об]. Денежное поощрение за их труд было введено «Правилами

Репозиторий ВГУ